© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

# РТ–2018/2019 гг. Этап I

## Тэматычнае кансультаванне па беларускай мове

## Варыянт 1

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А1.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:<br>1) кветка (***Р***)***амонак***;<br>2) знаёмы (***М***)***інчанін***;<br>3) рака (***Н***)***ёман***;<br>4) верш ***«***(***С***)***падчына»***;<br>5) птушка (***С***)***нягір***.<br><br>**Адказ:** 3,4 | 1) *кветка* ***рамонак*** → назоўнік, які абазначае назву расліны, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>2) *знаёмы* ***мінчанін*** → назоўнік, які ўказвае на месца пражывання, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>3) *рака* ***Нёман*** → назоўнік, які абазначае геаграфічную назву, з'яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары;<br>4) *верш* ***«Спадчына»*** → назоўнік, які абазначае назву літаратурнага твора, з'яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары;<br>5) *птушка* ***снягір*** → назоўнік, які абазначае назву птушкі, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Агульныя і ўласныя назоўнікі | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 18, 27 |
| **А2.** Адзначце словы (формы слоў), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***а***:<br>1) менедж_р;<br>2) гл_танне;<br>3) ч_рнавалосы;<br>4) мар_зы;<br>5) ш_птаць.<br><br>**Адказ:** 1,4,5 | 1) *ме́неджар* → запазычанае слова, якое з'яўляецца агульнай назвай і ў якім канцавое спалучэнне **-эр** не пад націскам перадаецца ў беларускай мове як **-ар**;<br>2) *глыта́нне* → спрадвечна беларускае слова, у якім націскны склад ***ло*** чаргуецца з ненаціскным ***лы***: *гло́тка – глыта́нне*;<br>3) *чорнавало́сы* → націск падае не на першы склад другой часткі складанага слова, таму ў першай яго частцы пішацца літара ***о***;<br>4) *маразы́* → спрадвечна беларускае слова, у якім не пад націскам гук [***о***] пераходзіць у гук [***а***], што і перадаецца на пісьме: *маро́з* – | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 34.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | *маразы́*;<br>5) *шапта́ць* → спрадвечна беларускае слова, у якім не пад націскам гук [**э**] пераходзіць у гук [**а**], што і перадаецца на пісьме: *шэ́пт* – *шапта́ць* | | вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 26 |
| **А3.** Адзначце словы (прыклады), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:<br>1) заз_лянець;<br>2) земл_мерны;<br>3) б_з сэнсу;<br>4) мес_ц;<br>5) л_генда.<br><br>**Адказ:** 2,4 | 1) *заз**е**лянэ́ць* → спрадвечна беларускае слова, у якім не ў першым пераднаціскным складзе пішацца літара ***е***;<br>2) *земл**я**ме́рны* → складанае слова, у якім пішацца злучальная літара ***я***, бо націск падае на першы склад другой яго часткі;<br>3) *б**е**з сэ́нсу* → прыназоўнік ***без*** заўсёды пішацца з літарай ***е***;<br>4) *ме́с**я**ц* → спрадвечна беларускае слова, у якім незалежна ад месца націску захоўваецца каранёвая этымалагічная літара ***я***;<br>5) *л**е**ге́нда* → запазычанае слова, у якім пішацца літара ***е*** незалежна ад месца націску | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 35.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 26 |
| **А4.** Адзначце словы (прыклады) з правільным напісаннем падкрэсленых літар:<br>1) пра ***У***сяслава Чарадзея;<br>2) соцы***ў***м;<br>3) мо***ў***чкі;<br>4) рабочы-***у***дарнік;<br>5) а***ў***ра.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *пра **У**сяслава Чарадзея* → у пачатку ўласнай назвы пішацца літара ***У*** (складовае) і пасля галоснага;<br>2) *со́цы**ум*** → у запазычаным слове, якое заканчваецца на ***-ум***, пішацца літара ***у*** (складовае);<br>3) *мо́**ў**чкі* → слова, у якім адбылося чаргаванне зычных гукаў [***л***] і [***ў***] (параўнайце ў рускай мове: ***молча***);<br>4) *рабочы-**ў**дарнік* → пасля злучка, які не з’яўляецца знакам прыпынку, пішацца літара ***ў*** (нескладовае), бо папярэдняе слова заканчваецца на галосны;<br>5) *а́**ў**ра* → пасля галоснага ў сярэдзіне запазычанага слова не пад націскам пішацца літара ***ў*** (нескладовае) | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс ***у***–***ў*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А5.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) дробь;<br>2) камусьці;<br>3) паштальён;<br>4) цвілы;<br>5) карэньчык.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 1) *дроб* → *мяккі знак* не пішацца пасля губнога зычнага гука [***п***]: [*дроп*];<br>2) *камусьці* → у постфіксе **-*сьці*** пішацца *мяккі знак*;<br>3) *пашталь**ё**н* → пасля зычнага [***л'***] перад літарай ***ё***, якая абазначае два гукі [***йо***], у запазычаным слове пішацца *раздзяляльны* ***ь***;<br>4) *цвілы* → пасля [***ц'***] перад мяккім зычным [***в'***] *мяккі знак* не пішацца;<br>5) *карэ**нь**чык* → у назоўніку, утваральная аснова якога заканчваецца на -***нь*** (*корань*), перад памяншальна-ласкальным суфіксам -***чык***- пішацца *мяккі знак* | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс мяккага знака і апострафа | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 5, 6.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |
| **А6.** Адзначце правільна напісаныя словы (формы слоў):<br>1) бессістэмны;<br>2) выключанныя;<br>3) насенне;<br>4) галлерэя;<br>5) памяцью.<br><br>**Адказ:** 1,3 | 1) *бе**сс**істэмны* → спалучэнне аднолькавых зычных гукаў на стыку прыстаўкі і кораня перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***сс***);<br>2) *выключа**ны**я* → у суфіксе -***ан***- дзеепрыметніка пішацца адна літара ***н***;<br>3) *насе**нн**е* → падаўжэнне зычнага гука [***н'***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***нн***);<br>4) *га**л**ерэя* → у слове іншамоўнага паходжання падаўжэнне зычных гукаў не адбываецца і пішацца адна літара ***л***;<br>5) *памя**цц**ю* → у назоўніку 3-га скланення ў форме творнага склону адзіночнага ліку падаўжэнне зычнага гука [***ц'***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***цц***) | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Падоўжаныя зычныя, іх правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 9.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 19.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 29 |
| **А7.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) прозьба;<br>2) колькастны;<br>3) сэрца;<br>4) загрушчык;<br>5) гушчар. | 1) *просьба* → азванчэнне зычнага гука [***с'***] пры вымаўленні перад звонкім [***б***] на пісьме не перадаецца; вымаўляем: [*проз'ба*]; правяраем: *прасіць*; пішам: *просьба*;<br>2) *колька**сны*** → гістарычнае спалучэнне зычных гукаў [***стн***] вымаўляецца як [***сн***], | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Зычныя гукі. Іх вымаўленне і | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 1, 2. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** 3,5 | што і передаецца на пісьме;<br>3) *сэрца* → гістарычнае спалучэнне зычных гукаў [**рдц**] вымаўляецца як [**рц**], што і передаецца на пісьме;<br>4) *загрузчык* → прыпадабненне свісцячага зычнага гука [**з**] пры вымаўленні да шыпячага зычнага [**ч**] на пісьме не передаецца; вымаўляем: [*загру**шч**ык*]; правяраем: *загру**з**іць*; пішам: *загру**з**чык*;<br>5) *гу**шч**ар* → спалучэнне зычных гукаў [**ст**] на канцы кораня слова чаргуецца з [**шч**], што і передаецца на пісьме: *гу**ст**ы* – *гу**шч**ар* | правапіс. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15,16 |
| **А8.** Адзначце словы (формы слоў), у якіх выдзелены ***канчатак***:<br>1) мера**ем**ся;<br>2) хораш**а**;<br>3) надкусі**ўшы**;<br>4) прыбегл**а**;<br>5) весял**осць**.<br><br>**Адказ:** 1,4 | 1) *мера**ем**ся* → у зваротным дзеяслове ў форме 1-й асобы множнага ліку выдзелены канчатак (параўнайце: *мера**ю**ся*, *мера**еш**ся*); **-ся** – постфікс;<br>2) *хораш**а*** → у прыслоўі выдзелены суфікс; прыслоўе – нязменная часціна мовы і не мае канчатка;<br>3) *надкусі**ўшы*** → у дзеепрыслоўі выдзелены суфікс; дзеепрыслоўе – нязменная форма дзеяслова і не мае канчатка;<br>4) *прыбегл**а*** → у дзеяслове прошлага часу адзіночнага ліку жаночага роду выдзелены канчатак (параўнайце: *прыбегл**і***);<br>5) *весял**осць*** → у назоўніку 3-га скланення ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку выдзелены суфікс (параўнайце: *весялос**ці***, *весялос**цю***) | Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Культура маўлення. Марфемы як структурна значымыя часткі слова | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 24–27.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 64, 65.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 18, 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 23, 25, 37, 38, 40, 43 |
| **А9.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (паў) Віцебска;<br>2) (барэц) самбіст;<br>3) (ультра) гук;<br>4) (праўда) шукальнік; | 1) *паў-Віцебска* → частка ***паў-*** з уласным назоўнікам пішацца праз злучок;<br>2) *барэц-самбіст* → назоўнік ***барэц*** з аднаслоўным прыдаткам ***самбіст*** пішацца праз злучок; | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Складаныя назоўнікі, іх | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 5) (кілаграм) калорыя.<br><br>**Адказ:** 1,2,5 | 3) *ультрагук* → складаны назоўнік з першай іншамоўнай часткай ***ультра***- пішацца разам;<br>4) *праўдашукальнік* → складаны назоўнік, утвораны шляхам спалучэння дзвюх асноў ***праўд***- і ***шукальнік***- з дапамогай злучальнай літары ***а***, пішацца разам;<br>5) *кілаграм-калорыя* → складаны назоўнік са значэннем цэласнай адзінкі вымярэння пішацца праз злучок | утварэнне і правапіс | 2014; § 33.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 27.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А10.** Адзначце прыклады, у якіх ад выдзеленых лічэбнікаў правільна ўтворана форма давальнага склону:<br>1) ***паўтара*** – паўтарам;<br>2) ***дзве*** – дзвюм;<br>3) ***семдзесят*** – сямідзесяці;<br>4) ***сямёра*** – семярым;<br>5) ***сто адзін*** – стам аднаму.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 1) ***паўтара*** – *паўтара* → колькасны дробавы лічэбнік, які ва ўсіх склонах мае толькі адну форму – ***паўтара***;<br>2) ***дзве*** – *дзвюм* → колькасны лічэбнік ***дзве*** ў форме давальнага склону мае канчатак -***юм***;<br>3) ***семдзесят*** – *сямідзесяці* → у складаным колькасным лічэбніку абедзве часткі змяняюцца як назоўнікі трэцяга скланення з асновай на мяккі зычны гук (*сямідзесяці* – *вернасці*);<br>4) ***сямёра*** – *семярым* → колькасны зборны лічэбнік скланяецца як прыметнік множнага ліку (*семяр**ым*** – *стар**ым***);<br>5) ***сто адзін*** – *ста аднаму* → у састаўным колькасным лічэбніку, які абазначае цэлы лік, пры скланенні змяняюцца абодва словы: лічэбнік ***сто*** ў давальным склоне мае форму *ст**а***, лічэбнік ***адзін*** змяняецца як прыметнік з асновай на цвёрды зычны (*адн**аму*** – *зялён**аму***) | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Скланенне і правапіс колькасных лічэбнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46, 48, 49.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 34 |
| **А11.** Адзначце словы, якія пішуцца разам:<br>1) (адносна) спакойны;<br>2) (фота) тэлевізійны;<br>3) (вакальна) інструментальны;<br>4) (шасці) ярусны;<br>5) (высока) маральны. | 1) *адносна спакойны* → прыслоўе і прыметнік, якія захоўваюць сваю лексічную самастойнасць (***спакойны адносна***), пішуцца асобна;<br>2) *фотатэлевізійны* → складаны прыметнік з першай іншамоўнай часткай ***фота***- пішацца | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс складаных прыметнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33. |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** 2,4,5 | разам;<br>3) *вакальна-інструментальны* → складаны прыметнік, утвораны ад двух раўназначных слоў (***вакальны*** і ***інструментальны***), пішацца праз злучок;<br>4) *шасціярусны* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***шэсць ярусаў***), пішацца разам;<br>5) *высокамаральны* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***высокая мараль***), пішацца разам | | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А12.** Адзначце прыклады, у якіх выдзелены дзеяслоў правільна запісаны ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу:<br>1) ***запрасіць*** – запросіш;<br>2) ***падсцерагчы*** – падсцеражэш;<br>3) ***пазычыць*** – пазычаеш;<br>4) ***завязаць*** – завяжаш;<br>5) ***прачынацца*** – прачнешся.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | 1) ***запрасіць*** – *запросіш* → дзеяслоў II спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на мяккі зычны гук мае канчатак ***-іш***;<br>2) ***падсцерагчы*** – *падсцеражэ́ш* → дзеяслоў I спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук мае пад націскам канчатак ***-э́ш***;<br>3) ***пазычыць*** – *пазычыш* → дзеяслоў II спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук мае канчатак ***-ыш***;<br>4) ***завязаць*** – *завя́жаш* → дзеяслоў I спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук мае не пад націскам канчатак ***-аш***;<br>5) ***прачынацца*** – *прачынаешся* → зваротны дзеяслоў I спражэння незакончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу пасля асновы на мяккі зычны гук (*прачына*[***йэ***]*шся*) мае канчатак ***-еш-***; ***-ся*** – *постфікс* | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Трыванне дзеяслова. Утварэнне дзеясловаў закончанага і незакончанага трыванняў. Канчаткі дзеясловаў I і II спражэнняў, іх правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 61, 65.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; практ. 320; § 38 |
| **А13.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя | 1) ***патроху*** *збірацца* → прыслоўе, утворанае | Марфалогія і | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| словы трэба пісаць разам:<br>1) (***па***) ***троху*** збірацца;<br>2) спяваць (***у***) ***двух***;<br>3) (***што***) ***раніцы*** чакаць;<br>4) (***па***) ***сяброўску*** дапамагчы;<br>5) быць (***на***) ***віду***.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | ад прыслоўя ***трохі*** пры дапамозе прыстаўкі ***па-*** і суфікса ***-у***, пішацца разам;<br>2) *спяваць* ***удвух*** → прыслоўе, утворанае ад колькаснага лічэбніка ***два*** пры дапамозе прыстаўкі ***у-*** і суфікса ***-ух***, пішацца разам;<br>3) ***штораніцы*** *чакаць* → прыслоўе з першай часткай ***што-*** пішацца разам;<br>4) ***па-сяброўску*** *дапамагчы* → прыслоўе, якое мае прыстаўку ***па-*** і заканчваецца на ***-ску***, пішацца праз злучок;<br>5) *быць* ***на віду*** → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне назоўніка з прыназоўнікам пішацца асобна | арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў | вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 27–30.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 19, 43; практ. 344 |
| **А14.** Адзначце прыклады, у якіх часціцу ***не*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:<br>1) (**не**) ***намаляваны*** пейзаж;<br>2) (**не**) ***сумненная*** ўдача;<br>3) (**не**) ***заехалі*** да сябра;<br>4) дровы (**не**) ***прывезены***;<br>5) (**не**) ***паставіўшы*** коскі.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 1) ***ненамаляваны*** *пейзаж* → ***не*** з поўным дзеепрыметнікам, пры якім няма залежных слоў, пішацца разам;<br>2) ***несумненная*** *ўдача* → ***не-*** – прыстаўка, без якой слова ***несумненная*** не ўжываецца;<br>3) ***не заехалі*** *да сябра* → ***не*** з дзеясловам пішацца асобна;<br>4) дровы ***не прывезены*** → ***не*** з кароткім дзеепрыметнікам пішацца асобна; поўны дзеепрыметнік у форме множнага ліку будзе мець канчатак ***-ыя***: ***прывезеныя***;<br>5) ***не паставіўшы*** *коскі* → ***не*** з дзеепрыслоўем пішацца асобна | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Правапіс часціцы ***не*** з рознымі часцінамі мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 42, 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 12, 15, 47.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 5.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 48 |
| **А15.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) ужываецца часціца ***ні***:<br>1) Якіх толькі нот __ бяруць дразды!<br>2) І куды б __ пайшоў, застаюся пад буслінам крылом Белай Русі. | 1) *Якіх толькі нот* ***не*** *бяруць дразды!* → для надання сцвярджэння сказу пытальна-клічнага тыпу ўжываецца часціца ***не***;<br>2) *І куды б* ***ні*** *пайшоў, застаюся пад буслінам крылом Белай Русі.* → у дадзенай частцы | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 46. |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 3) У небе блакітным __ хмурынкі.<br>4) Лес __ спіць, лес весела шуміць.<br>5) __ магу __ радавацца з’яўленню зор у нябеснай вышыні, з’яўленню соку з глыбіні карэння, з’яўленню траў у веснавыя дні.<br><br>**Адказ:** 2,3 | складаназалежнага сказа для ўзмацнення сцвярджэння ўжываецца часціца ***ні***;<br>3) *У небе блакітным* ***ні*** *хмурынкі.* → для надання адмоўнага значэння сказу без дзейніка ўжываецца часціца ***ні***, якая стаіць пры дапаўненні – назоўніку ***хмурынкі*** ў форме роднага склону;<br>4) *Лес* ***не*** *спіць, лес весела шуміць.* → для надання адмоўнага значэння сказу пры дзеяслове-выказніку ўжываецца часціца ***не***;<br>5) ***Не*** *магу* ***не*** *радавацца з’яўленню зор у нябеснай вышыні, з’яўленню соку з глыбіні карэння, з’яўленню траў у веснавыя дні.* → часціца ***не*** ўжываецца пры кожнай частцы састаўнога дзеяслоўнага выказніка і надае сказу сцвярджальны сэнс | | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 47 |
| **А16.** Адзначце словазлучэнні (спалучэнні слоў), якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:<br>1) пазбавіцца недахопаў;<br>2) пайсці за часопісам;<br>3) захісталіся голлі;<br>4) роўная стэп;<br>5) смяяцца са шчаняці.<br><br>**Адказ:** 1,5 | 1) *пазбавіцца недахопаў* → пры дзеяслове ***пазбавіцца*** залежнае слова ўжываецца ў форме роднага склону без прыназоўніка;<br>2) *пайсці па часопіс* → дзеяслоў руху ***пайсці*** мае мэтавае значэнне і спалучаецца з назоўнікам у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***па***;<br>3) *захісталася голле* → зборны назоўнік ***голле*** мае толькі форму адзіночнага ліку, і ў гэтай жа граматычнай форме да яго дапасуецца дзеяслоў ***захісталася***;<br>4) *роўны стэп* → назоўнік ***стэп*** у беларускай мове адносіцца да мужчынскага роду, і ў гэтай жа граматычнай форме да яго дапасуецца прыметнік;<br>5) *смяяцца са шчаняці* → дзеяслоў ***смяяцца*** патрабуе ад назоўніка формы роднага склону з прыназоўнікам ***са*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асаблівасці кіравання і дапасавання ў беларускай мове | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; практ. 96.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 8; практ. 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 9; С. 242–244 |
| **А17.** Адзначце сказы, у якіх правільна вызначаны ***выказнік***:<br>1) Сяброўка параіла мне ***з’ездзіць*** летам у Іспанію. | 1) *Сяброўка параіла мне з’ездзіць летам у Іспанію.* → інфінітыў ***з’ездзіць*** адносіцца да дзеяслова-выказніка ***параіла***, адказвае на пытанне *што?* і з’яўляецца дапаўненнем; | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Выказнік і спосабы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 2) Ва ўніверсітэце я ***буду*** вывучаць польскую мову.<br>3) Бор за нашай вёскай ***стромкі***, ***высокі***.<br>4) Самая доўгая пешаходная вуліца ў Беларусі ***цягнецца*** паўтара кіламетра.<br>5) Восень, ***вядома***, заўсёды на дары багатая.<br><br>**Адказ:** 3,4 | 2) *Ва ўніверсітэце я буду вывучаць польскую мову.* → выказнік ***буду вывучаць*** мае складаную форму будучага часу;<br>3) *Бор за нашай вёскай стромкі, высокі.* → састаўны іменны выказнік, у якім дзеяслоў-звязка адсутнічае (нулявая звязка); іменная частка выражана прыметнікамі ***стромкі*** і ***высокі*** (*бор які ён ёсць?*);<br>4) *Самая доўгая пешаходная вуліца ў Беларусі цягнецца паўтара кіламетра.* → выказнік ***цягнецца*** выражаны дзеясловам;<br>5) *Восень, вядома, заўсёды на дары багатая.* → слова ***вядома*** – пабочнае, якое членам сказа не з'яўляецца; выказнік у сказе выражаны прыметнікам ***багатая*** | яго выражэння | ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 29, 54, 56, 64.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 3.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 17–19, 24, 44.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 11 |
| **А18.** Адзначце аднасастаўныя сказы:<br>1) Казкі ў нашага народа прыгожыя, мудрыя.<br>2) Цёпла прымалі на Пастаўшчыне ўдзельнікаў фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік».<br>3) Ад успамінаў пасвятлела на душы.<br>4) Лянівы два разы ходзіць.<br>5) Не шкадуйце, людзі, добрых слоў для бацькоў, для сяброў, для незнаёмых.<br><br>**Адказ:** 2,3,5 | 1) *Казкі ў нашага народа прыгожыя, мудрыя.* → двухсастаўны сказ: дзейнік ***казкі*** выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону; у састаўным іменным выказніку дзеяслоў-звязка адсутнічае (нулявая звязка), іменная частка выражана прыметнікамі ***прыгожыя***, ***мудрыя***;<br>2) *Цёпла прымалі на Пастаўшчыне ўдзельнікаў фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік».* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік ***прымалі*** выражаны дзеясловам у форме прошлага часу множнага ліку;<br>3) *Ад успамінаў пасвятлела на душы.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік ***пасвятлела*** выражаны асабовым | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення.<br>Двухсастаўныя сказы.<br>Аднасастаўныя сказы, іх будова | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 15–19, 27–31.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 11 |

| **Заданне. Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| | дзеясловам у безасабовым значэнні;<br>4) *Лянівы два разы ходзіць.* → двухсастаўны сказ: дзейнік ***лянівы*** выражаны прыметнікам у значэнні назоўніка ў форме назоўнага склону; выказнік ***ходзіць*** – дзеясловам у форме 3-й асобы адзіночнага ліку;<br>5) *Не шкадуйце, людзі, добрых слоў для бацькоў, для сяброў, для незнаёмых.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма (зваротак ***людзі*** членам сказа не з’яўляецца); выказнік ***не шкадуйце*** выражаны дзеясловам загаднага ладу ў форме 2-й асобы множнага ліку | | |
| **А19.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ***абавязкова*** ставіцца працяжнік:<br>1) Прыпяць __ прыток Дняпра.<br>2) Вясной крынічка __ быццам флейта.<br>3) Спёка __ хоць гвалт крычы.<br>4) Жарт __ не жарт, калі ніхто не засмяяўся.<br>5) Лес, бясспрэчна, __ наша багацце.<br><br>**Адказ:** 1,3 | 1) *Прыпяць – прыток Дняпра.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>2) *Вясной крынічка быццам флейта.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ёсць параўнальны злучнік ***быццам***, таму працяжнік ***не ставіцца***;<br>3) *Спёка – хоць гвалт крычы.* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным фразеалагізмам, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>4) *Жарт не жарт, калі ніхто не засмяяўся.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ёсць адмоўная часціца ***не***, таму працяжнік ***не ставіцца***;<br>5) *Лес, бясспрэчна, наша багацце.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, стаіць пабочнае слова ***бясспрэчна***, таму працяжнік ***не ставіцца*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 12.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 21 |
| **А20.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску | 1) *Прыгажосць заўсёды вабіць, і радуе, і* | Сінтаксіс і | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| трэба паставіць коску:<br>1) Прыгажосць заўсёды вабіць__ і радуе, і натхняе.<br>2) Скрыпку, гітару, кантрабас__ усе гэтыя музычныя інструменты я паспяхова асвоіў.<br>3) Стаяць у роздуме глыбокім сосны-мачты, дубы-волаты__ ды елкі векавыя.<br>4) Аб пісьменніцкай працы мяркуюць не па колькасці__ а па вартасці напісанага.<br>5) У вялікую__ беларускую гісторыю ўвайшло шмат Усяслававых нашчадкаў, але найбольшую славу атрымала Ефрасіння Полацкая.<br><br>**Адказ:** 1,4 | *натхняе.* → коскамі раздзяляюцца аднародныя выказнікі, звязаныя паўторным спалучальным злучнікам ***і***;<br>2) *Скрыпку, гітару, кантрабас* **–** *усе гэтыя музычныя інструменты я паспяхова асвоіў.* → функцыю абагульняльнага слова выконвае словазлучэнне ***усе інструменты***, перад якім пасля аднародных дапаўненняў ***скрыпку***, ***гітару***, ***кантрабас*** ставіцца працяжнік;<br>3) *Стаяць у роздуме глыбокім сосны-мачты, дубы-волаты ды елкі векавыя.* → паміж аднароднымі дзейнікамі, звязанымі пры дапамозе адзіночнага спалучальнага злучніка ***ды*** (=***і***), коска не ставіцца;<br>4) *Аб пісьменніцкай працы мяркуюць не па колькасці**,** а па вартасці напісанага.* → паміж аднароднымі дапаўненнямі, звязанымі пры дапамозе супраціўнага злучніка, ставіцца коска;<br>5) *У вялікую беларускую гісторыю ўвайшло шмат Усяслававых нашчадкаў, але найбольшую славу атрымала Ефрасіння Полацкая.* → паміж неаднароднымі азначэннямі, выражанымі якасным прыметнікам ***вялікую*** і адносным прыметнікам ***беларускую***, коска не ставіцца | пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа | вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; §§ 19, 20.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 37–41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 12; практ. 99, 100, 104 |
| **А21.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:<br>1) Сыходзіць на зямлю цішыня вечаровая, яна__ быццам маг__ ахутвае нас, зачароўвае.<br>2) Выветрыўшы__ як след__ неба, па свеце ходзяць лістападаўскія халады.<br>3) Лічылкі__ як жанр дзіцячага фальклору__ захоўваюцца сёння дзякуючы мультфільмам, вершам, песням і іншым мастацкім творам.<br>4) Прырода гаворыць з намі без слоў, яна далікатна__ што тонкі псіхолаг__ звяртаецца | 1) *Сыходзіць на зямлю цішыня вечаровая, яна**,** быццам маг**,** ахутвае нас, зачароўвае.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***быццам маг***; ***быццам*** – параўнальны злучнік;<br>2) *Выветрыўшы як след неба, па свеце ходзяць лістападаўскія халады.* → не выдзяляецца коскамі фразеалагізм ***як след***;<br>3) *Лічылкі як жанр дзіцячага фальклору захоўваюцца сёння дзякуючы мультфільмам, вершам, песням і іншым* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 52, 53.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| адразу да душы.<br>5) Па асфальце__ нібы па клавішах раяля__ пастукваюць шрацінкі граду.<br><br>**Адказ:** 1,4,5 | *мастацкім творам.* → не выдзяляецца коскамі зварот ***як жанр дзіцячага фальклору***, які мае значэнне ‘*ў якасці*’ (*лічылкі* і ёсць *жанр дзіцячага фальклору*);<br>4) *Прырода гаворыць з намі без слоў, яна далікатна**,** што тонкі псіхолаг**,** звяртаецца адразу да душы.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***што тонкі псіхолаг***; ***што*** – параўнальны злучнік;<br>5) *Па асфальце**,** нібы па клавішах раяля**,** пастукваюць шрацінкі граду.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***нібы па клавішах раяля***; ***нібы*** – параўнальны злучнік | | |
| **А22.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Валошкі__ ці інакш васількі__ выкарыстоўваюць у якасці лекаў пры захворванні вачэй.<br>2) Уцякала зіма ад вясны__ не азіраючыся.<br>3) Апрача беларускай мовы__ Леў Сапега ведаў яшчэ лацінскую, грэчаскую, нямецкую і польскую.<br>4) Аздоблены дзіўнымі ўзорамі__ куфар сёння часам яшчэ можна ўбачыць у вясковай хаце.<br>5) Несупынна цягнуць цяжкі груз__ перакульваючы яго праз розныя перашкоды__ нястомныя мурашкі.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *Валошкі**,** ці інакш васількі**,** выкарыстоўваюць у якасці лекаў пры захворванні вачэй.* → выдзяляецца коскамі адасоблены прыдатак ***ці інакш васількі***, пры якім ёсць злучнік ***ці*** і які мае ўдакладняльнае значэнне;<br>2) *Уцякала зіма ад вясны не азіраючыся.* → коскай не аддзяляецца выражаная адзіночным дзеепрыслоўем акалічнасць ***не азіраючыся***, якая стаіць у канцы сказа і сваім значэннем набліжаецца да прыслоўя спосабу дзеяння (адказвае на пытанне *як?*);<br>3) *Апрача беларускай мовы**,** Леў Сапега ведаў яшчэ лацінскую, грэчаскую, нямецкую і польскую.* → аддзяляецца коскай адасобленае дапаўненне ***Апрача беларускай мовы***, выражанае назоўнікам у форме роднага склону з прыназоўнікам ***апрача*** + прыметнік;<br>4) *Аздоблены дзіўнымі ўзорамі куфар сёння часам яшчэ можна ўбачыць у вясковай хаце.* → не аддзяляецца коскай дапасаванае азначэнне ***Аздоблены дзіўнымі ўзорамі***, выражанае дзеепрыметнікавым зваротам, | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення. Знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 7, 16.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46–50.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | бо стаіць перад паяснёным назоўнікам ***куфар*** і не мае дадатковага акалічнаснага значэння прычыны ці ўступкі;<br>5) *Несупынна цягнуць цяжкі груз**,** перакульваючы яго праз розныя перашкоды**,** нястомныя мурашкі.* → выдзяляецца коскамі адасобленая акалічнасць ***перакульваючы яго праз розныя перашкоды***, выражаная дзеепрыслоўным зваротам | | |
| **А23.** Адзначце сказы, у якіх ёсць пабочныя канструкцыі (словы, словазлучэнні, сказы), што трэба выдзеліць (аддзяліць) коскамі (коскай):<br>1) Калі журавы ляцяць высока, не спяшаюцца і курлыкаюць, будзе добрая восень, аднак чакай непагоды, калі яны ляцяць нізка, хутка і моўчкі.<br>2) Добра сонечным зімовым ранкам са мною ж вы не станеце спрачацца пакатацца на лыжах ці на санках.<br>3) Розуму нават за грошы не купіш.<br>4) Павуціння ў сярэдзіне верасня было так многа, што ім аплецены здавалася быў увесь свет.<br>5) Каб лепш запомніць той ці іншы тэкст, карысна на маю думку прагаворваць яго ўслых.<br><br>**Адказ:** 4,5 | 1) *Калі журавы ляцяць высока, не спяшаюцца і курлыкаюць, будзе добрая восень, аднак чакай непагоды, калі яны ляцяць нізка, хутка і моўчкі.* → пабочнай канструкцыі ў сказе няма; ***аднак*** – супраціўны злучнік, які звязвае дзве сэнсавыя часткі складанага сказа з рознымі відамі сувязі частак;<br>2) *Добра сонечным зімовым ранкам (са мною ж вы не станеце спрачацца) пакатацца на лыжах ці на санках.* → пабочнай канструкцыі ў сказе няма; устаўная канструкцыя ***са мною ж вы не станеце спрачацца***, якая па сэнсе не звязана з асноўным зместам сказа, а падаецца як дадатковая заўвага, бярэцца ў дужкі або выдзяляецца працяжнікамі;<br>3) *Розуму нават за грошы не купіш.* → пабочнай канструкцыі ў сказе няма; узмацняльная часціца ***нават*** у ролі пабочнага слова не выступае і коскамі не выдзяляецца;<br>4) *Павуціння ў сярэдзіне верасня было так многа, што ім аплецены**,** здавалася**,** быў увесь свет.* → у сказе ёсць пабочнае слова ***здавалася***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, не з'яўляецца членам сказа і ўказвае на меншую ступень упэўненасці ў паведамленні; пабочнае слова | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 44.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 14 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | выдзяляецца коскамі;<br>5) *Каб лепш запомніць той ці іншы тэкст, карысна**,** на маю думку**,** прагаворваць яго ўслых.* → у сказе ёсць пабочнае словазлучэнне ***на маю думку***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, не выконвае ролі члена сказа, указвае на крыніцу паведамлення і выдзяляецца коскамі | | |
| **А24.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:<br>1) Зноў поўнач рассыпала зорны авёс__ і выйшаў маладзік на ліловую пашу нябёс.<br>2) Спынілі гамонку лясы__ і на травах мядовых аселі крупінкі вячэрняй расы.<br>3) Святло маланкі__ і грому грукат.<br>4) Некаму падабаюцца шырокія вуліцы, праспекты__ а я больш люблю ціхія завулачкі.<br>5) Яшчэ дзень-два__ і пабяжыць па ствалах бярозавік.<br><br>**Адказ:** 2,4 | 1) *Зноў поўнач рассыпала зорны авёс і выйшаў маладзік на ліловую пашу нябёс.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца, бо ў першай частцы ёсць агульная для абедзвюх частак акалічнасць ***зноў***;<br>2) *Спынілі гамонку лясы**,** і на травах мядовых аселі крупінкі вячэрняй расы.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад спалучальным злучнікам ***і*** ставіцца коска;<br>3) *Святло маланкі і грому грукат.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія з'яўляюцца назыўнымі сказамі, перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца;<br>4) *Некаму падабаюцца шырокія вуліцы, праспекты**,** а я больш люблю ціхія завулачкі.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з супастаўляльнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***а*** ставіцца коска;<br>5) *Яшчэ дзень-два **–** і пабяжыць па ствалах бярозавік.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія паказваюць на хуткую змену падзей і звязаны спалучальным злучнікам ***і***, ставіцца працяжнік | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 6–11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 16 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А25.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) ***не трэба*** ставіць знак (знакі) прыпынку:<br>1) Жыта__ на каласах якога дыяментамі пераліваліся кроплі дажджу__ было ўжо спелае.<br>2) Трава ў маі расце з такой хуткасцю, што__ калі прыслухацца, то ўловіш яе шапаценне.<br>3) Набрынялыя пупышкі__ што драмалі яшчэ ўчора__ сёння ахінаюць пышна галінкі.<br>4) Калі восень прыходзіць у край наш лясны__ замаўкаюць птушыныя звонкія спевы.<br>5) Ідзём на палянку, дзе ярка ад суніц__ і дзе чмялі аж млеюць ад паху медуніц.<br><br>**Адказ:** 2,5 | 1) *Жыта**,** на каласах якога дыяментамі пераліваліся кроплі дажджу**,** было ўжо спелае.* → у складаназалежным сказе даданая частка, якая стаіць у сярэдзіне галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***якога***, выдзяляецца коскамі;<br>2) *Трава ў маі расце з такой хуткасцю, што калі прыслухацца, то ўловіш яе шапаценне.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, дзе паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі***, якія стаяць побач, коску ставіць ***не трэба***, бо ёсць другая частка ***то*** парнага злучніка ***калі – то***;<br>3) *Набрынялыя пупышкі**,** што драмалі яшчэ ўчора**,** сёння ахінаюць пышна галінкі.* → у складаназалежным сказе даданая частка, якая стаіць у сярэдзіне галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***што***, выдзяляецца коскамі;<br>4) *Калі восень прыходзіць у край наш лясны**,** замаўкаюць птушыныя звонкія спевы.* → у складаназалежным сказе даданая частка, якая стаіць перад галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка ***калі***, аддзяляецца коскай;<br>5) *Ідзём на палянку, дзе ярка ад суніц і дзе чмялі аж млеюць ад паху медуніц.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, якія паясняюць у галоўнай акалічнасць ***на палянку***, адказваюць на адно і тое ж пытанне *якую?* і з'яўляюцца аднароднымі; паміж аднароднымі даданымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коску ставіць ***не трэба*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 13–21, 23, 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |
| **А26.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е: | 1) *Азірнуўся і зразумеў**:** па густым зарасніку, як вецер, прамчаўся спуджаны некім заяц.* → | Сінтаксіс і пунктуацыя. | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 1) Азірнуўся і зразумеў__ па густым зарасніку, як вецер, прамчаўся спуджаны некім заяц.<br>2) Здымае пробу з грэчкі пчолка__ сінее ў жыце васілёк.<br>3) Я люблю бываць у Батанічным садзе__ тут можна гартаць жывыя старонкі Чырвонай кнігі.<br>4) Ляснік быў упэўнены__ ёсць у бярлозе маленькае медзведзяня.<br>5) Прыйшоў працаваць__ няма чаго час марнаваць.<br><br>**Адказ:** 1,3,4 | паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо другая частка дапаўняе першую, развіваючы дзеяслоў-выказнік ***зразумеў***; паміж часткамі можна ўставіць злучнік ***што***;<br>2) *Здымае пробу з грэчкі пчолка**,** сінее ў жыце васілёк.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца коска, бо ў іх выражаюцца адносіны аднachасовасці з'яў; паміж часткамі можна ўставіць спалучальныя злучнікі ***і***, ***ды*** (=***і***);<br>3) *Я люблю бываць у Батанічным садзе**:** тут можна гартаць жывыя старонкі Чырвонай кнігі.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо ў другой частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>4) *Ляснік быў упэўнены**:** ёсць у бярлозе маленькае медзведзяня.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо другая частка раскрывае, удакладняе змест першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнік ***што***;<br>5) *Прыйшоў працаваць **–** няма чаго час марнаваць.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо першая частка паказвае на ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой частцы; у пачатку першай часткі можна паставіць злучнік ***калі*** | Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 26–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 18 |
| **А27.** Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць складанаму сказу з рознымі відамі сувязі частак:<br><br>*Седзячы на беразе рэчкі і дзелячыся сваімі сакрэтамі, мы з сястрою раптам змоўклі з жука якія выпаўз з вады і якія некаторы час нерухома ляжаў на пясочку пачала выклёўвацца* | **I** [1]*Седзячы на беразе рэчкі і дзелячыся сваімі сакрэтамі, мы з сястрою раптам змоўклі**:** **II** [2]з жука**,** [3]які выпаўз з вады і [4]які некаторы час нерухома ляжаў на пясочку**,** [2]пачала выклёўвацца маладзенькая, з празрыстымі, нібы слюда, крыльцамі* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 31, 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| *маладзенькая, з празрыстымі, нібы слюда, крыльцамі стракозка.*<br><br>1) у сказе прапушчана двукроп'е;<br>2) у сказе прапушчаны дзве коскі;<br>3) у сказе пастаўлены ўсе неабходныя знакі прыпынку;<br>4) у сказе прапушчаны працяжнік;<br>5) у сказе прапушчаны тры коскі.<br><br>**Адказ:** 1,2 | *стракозка.* → складанаму сказу з рознымі відамі сувязі частак адпавядаюць наступныя сцверджанні:<br>1) сцверджанне пад нумарам **1**: паміж **I** і **II** сэнсавымі часткамі ставіцца двукроп'е, бо яны звязаны бяззлучнікавай сувяззю і ў **II** частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў **I**; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>2) сцверджанне пад нумарам **2**: у **II** сэнсавай частцы аднародныя даданыя часткі **3** і **4**, якія стаяць у сярэдзіне галоўнай **2**, выдзяляюцца з двух бакоў коскамі.<br>Паміж аднароднымі даданымі часткамі **3** і **4**, звязанымі спалучальным злучнікам ***і***, коска не ставіцца | рознымі відамі сувязі частак | вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А28.** Адзначце знак (знакі) прыпынку, які (якія) трэба паставіць на месцы пропуску ў сказе:<br>*«Красачкі палявыя з выгляду, магчыма, простыя, – беручы букецік у рукі, сказала мама__ але я іх больш за ўсе астатнія люблю».*<br><br>1) коску і працяжнік;<br>2) кропку і працяжнік;<br>3) двукроп'е і працяжнік;<br>4) двукроп'е;<br>5) кропку.<br><br>**Адказ:** 1 | *«Красачкі палявыя з выгляду, магчыма, простыя, – беручы букецік у рукі, сказала мама*, **–** *але я іх больш за ўсе астатнія люблю».* → сказ з простай мовай, у якім:<br>1) словы аўтара разрываюць простую мову там, дзе павінна стаяць коска; пасля слоў аўтара трэба паставіць *коску і працяжнік* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 23.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 35, 36.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21 |

**Тэкст да заданняў А29, А30, В1–В6**

(1) *У кожнага народа ёсць **<u>свае</u>**, незвычайныя і непаўторныя, назоўнікі і дзеясловы, прыметнікі і прыслоўі…*

(2) *Мы, беларусы, **<u>хлеб</u>** рэжам і кроім.* (3) *Атрымліваюцца скібкі.* (4) *Сала толькі рэжам і на талеркі кладзём скрылікі.* (5) *Каровіна масла – гэта сметанковае ці топленае.* (6) *Расліннае масла мы называем алеем – аліўкавым, ільняным, праванскім, сланечнікавым.* (7) *З мясных страў найперш трэба **<u>адзначыць</u>** такія: ялавічына, смажаніна, смажонка, шынка, сальцісон, кіндзюк.*

(8) *Яшчэ прыгадаем, як чысцяць бульбу ў нас.* (9) *А **<u>бульбу</u>** ў нас абіраюць ці, калі яна маладая і з яе лёгка здымаецца лупінка, скрабуць.* (10) *Тут жа*

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td colspan="4">ўдакладнім, што вада, якая толькі закіпела, мае тры назвы: кіпень, кіпецень, вар. (11) Хоць і ёсць у роднай мове выраз тыпу «закіпяціць ваду», але часцей ужываецца «згатаваць вады». (12) А пра малако – «спарыць малака». (13) Адсюль і выразы «гатаваная вада», «паранае малако». (14) Дарэчы, свежае малако мы называем сырадоем. (15) Варачы страву, каб узяць, скажам, крупы ці соль ды ўкінуць у вялікі альбо <u>малы</u> чыгун, ужываем простыя, але чароўныя словы: прыгаршчы, жменя, шчопці.<br>(16) Згадзіцеся, незвычайна! (17) Згадзіцеся, непаўторна!</td></tr>
<tr><td>А29. Адзначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту:<br>1) тэкст гутарковага стылю;<br>2) тэкст мастацкага стылю;<br>3) тэкст навуковага стылю;<br>4) тэкст публіцыстычнага стылю;<br>5) тэкст афіцыйнага стылю.<br><br>Адказ: 4</td><td>тэксту адпавядае сцверджанне пад нумарам 4: тэкст публіцыстычнага стылю, таму што:<br>1) адрасат тэксту з'яўляецца масавым;<br>2) асноўная задача аўтара тэксту – паведаміць інфармацыю і ўздзейнічаць на пачуцці і думкі чытача, выклікаючы пэўны водгук;<br>3) матэрыял пададзены лаканічна, даходліва; характэрныя яму ацэначнасць і вобразнасць тлумачацца тым, што аўтар, перадаючы інфармацыю, выражае да яе сваё стаўленне;<br>4) у тэксце ўжыты эпітэты (незвычайныя, непаўторныя назоўнікі і дзеясловы, прыметнікі і прыслоўі, чароўныя словы), словы з памяншальна-ласкальным адценнем (скрылікі, лупінка) і іншыя моўныя сродкі, характэрныя для публіцыстычных жанраў;<br>5) сінтаксіс тэксту мае свае асаблівасці: пераважае выкарыстанне простых сказаў, ужываюцца няпоўныя і клічныя сказы (А пра малако – «спарыць малака».; Згадзіцеся, незвычайна! Згадзіцеся, непаўторна!)</td><td>Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Функцыянальныя стылі маўлення</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 13, 57.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>З.І. Бадзевіч і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 3, 10, 11, 33.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 4–8</td></tr>
<tr><td>А30. Адзначце сцверджанне, якое поўнасцю</td><td>слову, падкрэсленаму ў 9-м сказе тэксту,</td><td>Маўленне. Тэкст.</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова:</td></tr>
</table>

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| адпавядае слову, падкрэсленаму ў ***9-м*** сказе тэксту:<br>1) сінонім, які з'яўляецца ***адзіным*** сродкам сувязі 9-га сказа з 8-м;<br>2) сінонім, які з'яўляецца ***не адзіным*** сродкам сувязі 9-га сказа з 8-м;<br>3) прыслоўе, якое з'яўляецца ***адзіным*** сродкам сувязі 9-га сказа з 8-м;<br>4) лексічны паўтор, які з'яўляецца ***адзіным*** сродкам сувязі 9-га сказа з 8-м;<br>5) лексічны паўтор, які з'яўляецца ***не адзіным*** сродкам сувязі 9-га сказа з 8-м.<br><br>**Адказ:** 5 | ***поўнасцю*** адпавядае сцверджанне пад нумарам **5**:<br>1) сродкам сувязі 9-га сказа з 8-м з'яўляецца лексічны паўтор ***бульбу***; лексічны паўтор ***бульбу*** не адзіны сродак сувязі: сродкамі сувязі 9-га сказа з 8-м з'яўляюцца таксама злучнік ***а***, лексічны паўтор ***у нас***, аднолькавая форма часу дзеясловаў-сінонімаў ***чысцяць***, ***абіраюць***, ***скрабуць*** (дзеясловы ўжыты ў форме цяперашняга часу) | Стылістыка. Спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце | вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 26.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 9 |
| **В1.** Знайдзіце ў ***11-м*** сказе тэксту слова, у якім ёсць гук [***с***]. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***11-м*** сказе.<br><br>**Адказ:** выраз | 1) *выраз* → звонкі зычны гук [***з***] на канцы слова аглушаецца і вымаўляецца як глухі зычны [***с***]: [*выра**с***];<br>2) у словах *ёсць* і *часцей* – гук [***с'***]: [*йо**с'**ц'*], [*ча**с'**ц'эй*] | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Арфаэпічныя нормы: нормы беларускага літаратурнага вымаўлення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 1.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |
| **В2.** Утварыце і запішыце простую форму вышэйшай ступені параўнання прыметніка, падкрэсленага ў ***15-м*** сказе тэксту.<br><br>**Адказ:** меншы | 1) *меншы* → простая форма вышэйшай ступені параўнання прыметніка ***малы*** ўтвараецца пры дапамозе суфікса ***-ш-***;<br>2) выходны прыметнік ***малы*** і простая форма вышэйшай ступені параўнання ***меншы*** маюць розныя асновы | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | ўжыванне | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 31 |
| **В3.** Запішыце падкрэслены ў ***2-м*** сказе тэксту назоўнік у форме роднага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** хлеба | 1) *хлеба* → рэчыўны назоўнік 2-га скланення мужчынскага роду з асновай на цвёрды зычны гук, які ў форме роднага склону адзіночнага ліку традыцыйна мае канчатак ***-а*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Назоўнікі 2-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 11, 18.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 27, 29 |
| **В4.** Запішыце падкрэслены ў ***1-м*** сказе тэксту займеннік у форме роднага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** свайго | 1) *свайго* → у прыналежным займенніку ***свае*** ў форме роднага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду пішацца літара ***й*** (руск. мова – *своего*) | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Скланенне і правапіс займеннікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 53 |
| **В5.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў ***7-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** адзначаны | 1) ад асновы неазначальнай формы дзеяслова закончанага трывання ***адзначыць*** з дапамогай суфікса ***-ан-*** утвараецца поўны дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу ***адзначаны***; форма назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду – ***адзначаны*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 8, 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 40 |
| **В6.** У адным са сказаў ***6–10*** тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне ‘***ўзнавіць у памяці***’. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў адным са сказаў ***6–10***.<br><br>**Адказ:** прыгадаем | 1) лексічнае значэнне ‘*ўзнавіць у памяці*’ мае слова ***прыгадаць***;<br>2) ужытае ў ***8-м*** сказе тэксту слова ***прыгадаць*** мае граматычную форму ***прыгадаем*** | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Слова, яго лексічнае значэнне | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 20</td></tr>
<tr><td>В7. Знайдзіце ў прапанаваным сказе слова, пры ўжыванні якога парушана марфалагічная норма. Запішыце гэта слова ў патрэбнай граматычнай форме:<br><br>Восеньскі лес, быццам той баярын, мяняў кожны дзень сваё ўбранне: спачатку агарнуў усе дрэвы шаллю з жоўтай парчы, а потым пакрыху стаў дадаваць чырвонага, бурага і меднага колеру.<br><br>Адказ: шалем</td><td>1) у сказе парушана марфалагічная норма пры ўжыванні назоўніка шаль у форме творнага склону адзіночнага ліку: правільная граматычная форма назоўніка шаль, які ў беларускай мове адносіцца да мужчынскага роду, – шалем</td><td>Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 14.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 1.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 28; практ. 248</td></tr>
<tr><td colspan="4">В8. Устанавіце сэнсавую адпаведнасць паміж падкрэсленымі фразеалагізмамі ў левым і правым слупках. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><br>
<table>
<tr><td>А. Усё пакінуць след павінна, бо, як пачаўся <u>белы свет</u>, прамень, пясчынка і расінка нязменна пакідаюць след.<br>Б. «А хіба бліжэй не было працы, што ты падаўся <u>на край свету</u>?» – удакладніў у мяне аднакурснік.<br>В. У кожнага ў жыцці, спадзяюся, былі такія хвіліны, калі хочацца крыкнуць ад шчасця <u>на ўсю моц</u>.<br>Г. Віктар <u>чуць свет</u> забег да сябра, каб падзяліцца з ім ураджаннямі ад экскурсіі.</td><td>1. «Ты, Антось, спрачальнік, якіх <u>свет не бачыў</u>», – смяялася з суседа Ганна.<br>2. Добра ў вёсцы, прачнуўшыся <u>ні свет ні зара</u>, прабегчыся па роснай траве да рэчкі і плёхнуцца ў прыемную пасля цёплай ночы ваду.<br>3. «Не трэба мне ваш санаторый, не пацягнуся я <u>за блізкі свет</u>», – аднекваўся дзядуля.<br>4. Званы Хатыні гучаць <u>на ўвесь свет</u>.<br>5. Каторы год гляджу на <u>божы свет</u>, а ўсё ніяк не нагляджуся.</td></tr>
</table></td></tr>
<tr><td>Адказ: А5Б3В4Г2</td><td>1) фразеалагізм белы свет адпавядае па сэнсе фразеалагізму божы свет; фразеалагізмы маюць значэнне ‘навакольная рэчаіснасць – сусвет, зямля з усім, што на ёй існуе’;<br>2) фразеалагізм на край свету адпавядае па сэнсе фразеалагізму за блізкі свет; фразеалагізмы маюць значэнне ‘вельмі</td><td>Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 22.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа</td></tr>
</table>

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | *далёка*';<br>3) фразеалагізм ***на ўсю моц*** адпавядае па сэнсе фразеалагізму ***на ўвесь свет***; фразеалагізмы маюць значэнне '*вельмі гучна, голасна, моцна*';<br>4) фразеалагізм ***чуць свет*** адпавядае па сэнсе фразеалагізму ***ні свет ні зара***; фразеалагізмы маюць значэнне '*вельмі рана, досвіткам*' | | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 22 |

**В9.** Вызначце, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца падкрэсленыя ў сказах словы, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Добрым можа быць настрой ***і*** ў дажджлівы дзень. | **1.** Злучнік. |
| **Б.** ***Вакол*** ляснога азярца раслі бялюткія бярозкі. | **2.** Займеннік. |
| **В.** Буслы яшчэ не прыляцелі, ***затое*** ўжо паўсюль гаспадараць чорныя, як у сажы, шпакі. | **3.** Часціца. |
| **Г.** Самаму старому дубу, ***які*** знаходзіцца прыкладна за 35 кіламетраў ад Брэста, 850 гадоў. | **4.** Прыслоўе. |
| | **5.** Прыназоўнік. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А3Б5В1Г2 | 1) *і* → ***узмацняльная часціца***, якая вылучае, падкрэслівае сэнс слова ***дажджлівы*** і якую можна замяніць узмацняльнай часціцай ***нават*** (*Добрым можа быць настрой* ***нават*** *у дажджлівы дзень*.);<br>2) *вакол* → ***вытворны прыназоўнік***, які паходзіць ад прыслоўя ***вакол*** і выражае прасторавыя адносіны;<br>3) *затое* → ***злучальны злучнік***, які звязвае дзве часткі складаназлучанага сказа;<br>4) *які* → ***адносны займеннік***, які з'яўляецца злучальным словам (звязвае галоўную і дададзеную часткі складаназалежнага сказа); у сказе выконвае сінтаксічную ролю дзейніка | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Самастойныя і службовыя часціны мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 50.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 20, 21, 35, 41, 43, 44.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 4.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. |

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>Мінск: НІА, 2011; §§ 7, 9, 14, 15.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 35, 41, 44, 45</td></tr>
<tr><td colspan="4">В10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><br>А. Абагульненасць.<br>Б. Узбагаціць.<br>В. Дзяржгас.<br>Г. Разбор.<br><br>1. Прыставачна-суфіксальны.<br>2. Суфіксальны.<br>3. Бяссуфіксны.<br>4. Прыставачны.<br>5. Абрэвіяцыя.</td></tr>
<tr><td>Адказ: А2Б1В5Г3</td><td>1) абагульненасць → слова ўтворана суфіксальным спосабам: абагульнен-(ы) + суфікс -асць-;<br>2) узбагаціць → слова ўтворана прыставачна-суфіксальным спосабам: багат-(ы) + прыстаўка уз- і суфікс -і-;<br>3) дзяржгас → спосаб утварэння – абрэвіяцыя: складанаскарочанае слова (абрэвіятура), утворанае шляхам спалучэння частак слоў дзяржаўная і гаспадарка;<br>4) разбор → слова ўтворана бяссуфіксным спосабам: разбір/а/-(ць) + Ø (нулявы суфікс)</td><td>Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Асноўныя спосабы ўтварэння слоў</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 31, 32, 34.<br>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 24, 70.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 23, 25</td></tr>
</table>